УДК 94(476)"18/19"

# ГАНДЛЁВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ТАВАРЫСТВАЎ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

**П. П. Бухавец**

*ААТ «Печатный двор «Гомель», Рэспубліка Беларусь*

*Разгледжана развіццё гандлёвай дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў Магілеўскай губерні ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Вызначаецца роля і месца сельскагаспадарчых таварыстваў губерні ў станаўленні і развіцці мясцовага рынку сельскагаспадарчай тэхнікі, насення і штучных угнаенняў.*

70-я гг. XIX ст. адзначыліся стварэннем сельскагаспадарчых таварыстваў у трох беларускіх губернях. У значнай ступені гэта адбылося ў рамках падтрымкі рускага землеўладання ў Паўночна-Заходнім краі. Не менш важным фактарам было разуменне палітычнай элітай Расійскай імперыі ролі сельскагаспадарчых таварыстваў у развіцці эканомікі. Таму ў 1879 г. было заснавана Магілёўскае таварыства сельскай гаспадаркі (далей – МагТСГ), якое распаўсюджвала сваю дзейнасць на ўсю губерню. Сярод задач, якія ставіліся перад аб’яднаннем, быў як пошук спосабаў набыцця якаснага насення, земляробчых прылад, так і збыту сельскагаспадарчай прадукцыі [1, арк. 36]. Разгляд гэтых пытанняў адбыўся на адным з першых пасяджэнняў агульнага сходу МагТСГ ў 1880 г. У той жа год сябрам аб’яднання І. А. Мянжынскім пры дапамозе таварыства быў створаны склад земляробчых прылад і машын, насення і штучных угнаенняў у Оршы. Толькі за перыяд з 18 красавіка па 20 кастрычніка 1880 г. былі прададзены земляробчыя прылады на суму каля 3 тыс. р. [2, с. 1–3].

У пачатку 1881 г. А. П. Сянажэцкі прапанаваў адкрыць на свае сродкі склад у Гомелі. Агульны сход падтрымаў яго прапанову і абяцаў аказаць падтрымку, дзякуючы чаму склад пачаў працу ў тым жа годзе. Сума прададзеных тавараў у 1881 і 1882 гг. перавысіла 3,5 тыс. р. [2, с. 23], [3, арк. 19 адв.], [4, с. 3].

У студзені 1882 г. у сувязі з продажам маентка і выездам І. А. Мянжынскага з Магілёўскай губерні паўстала пытанне аб працягу дзейнасці склада ў Оршы. Магілёўскае таварыства сельскай гаспадаркі, прымаючы да ўвагі адсутнасць магчымага загадчыка ў Оршы, вырашыла перанесці склад ў Магілёў. Для падтрымкі дзейнасці склада было вырашана прасіць у Міністэрстве дзяржаўных маёмасцей аб выдзяленні датацыі. Прызнаючы важнасць дзейнасці падобных устаноў, Міністэрства выдзеліла 500 р. на ўладкаванне ў 1882 г. і 600 р. на ўтрыманне ў 1883 і 1884 гг. [5, с. 2–3, 14].

Адкрыццё склада ў Магілёве адбылося ў красавіку 1881 г. і за гэты год абароты дасягнулі 7 тыс. р. [3, арк. 19 адв.]. За няпоўны 1882 г. былі прададзены 128 плугоў і 150 лемяшоў да іх, 126 кос, 32 маслабойні, 25 акучнікаў, 14 веялак, 10 сеялак, 5 жалезных барон, 5 саламарэзак, 4 малатарні і 2 конных грабель. Значным попытам карысталіся штучныя ўгнаенні: гіпс, суперфасфат і касцяная мука, якіх прадалі 1 тыс. 479 пудоў. Насення канюшыны, вікі і цімафееўкі сельскія гаспадары набылі 224 пуды. У 1882 г. сума тавараў, набытых з абодвух складоў, створаных пры МагТСГ, перавысіла 11 тыс. р. Сярод першых пакупнікоў былі і сяляне, якія набывалі галоўным чынам шведскія плугі і акучнікі, а таксама насенне канюшыны і цімафееўкі [4, с. 2–4].

У 1883 г. склад у Магілеве прадаў тавараў на суму 12 тыс. 285 р. У наступным, 1884 г., продаж са складу значна знізіўся да 7 тыс. 410 р. Далейшае пагаршэнне гандлевай дзейнасці вымусіла МагТСГ пайсці на яго рэфармаванне. На надзвычайным пасяджэнні 7 мая 1885 г. было вырашана перадаць склад ў арэнду купцу і ўладальніку

садовай установы ў Магілёве С. Б. Язерскаму [6, s. 8]. У 1893 г. сельскагаспадарчы склад знаходзіўся ва ўласнасці С. Б. Язерскага, які быў сябрам МагТСГ [7, с. 2].

Праз адсутнасць інфарматыўных крыніц дакладна невядома, калі МагТСГ вярнулася да кіравання справамі сельскагаспадарчага склада. Зыходзячы з матэрыялаў «Обзора Могилевской губернии за 1900 год», склад знаходзіўся ў падпарадкаванні таварыства. Складам актыўна карысталіся сяляне, але ў перыяд 1905–1907 гг. гандлёвы абарот істотна знізіўся. У 1907 г. паўстала пытанне ліквідацыі запазычанасці ў памеры амаль 3 тыс. р., якая ўзнікла ад пашырэння асартыменту склада і зусім малога попыту [8, с. 92–93], [9, с. 101].

Па прыкладу Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі ў 1908 г. склад таварыства быў перададзены Камерцыйнаму аддзелу МагТСГ. Аддзелам было пабудаванае вялікае спецыяльнае памяшканне для склада. Рэфармаванне дзейнасці склада прынесла значны эканамічны эфект ужо ў 1908 г. Толькі штучнага ўгнаення было куплена 18 вагонаў, значную частку якога набылі сяляне. За першы год існавання абароты дасягнулі 40 тыс. р. [10, с. 46], [11, с. 100].

У пачатку XX ст., апроч МагТСГ склады былі створаныя Мсціслаўскім і Рагачоўскім сельскагаспадарчымі таварыствамі. З дазволу губернатара Мсціслаўскае СГТ адкрыла філіялы склада ў 9 з 10 валасцей павета, а агульны абарот у 1900 г. дасягаў 5 тыс. р. У 1911 г. пасля з’яўлення выбарнага земства Рагачоўскае СГТ перадала склад мясцовай павятовай управе [8, с. 92–93], [12, с. 86], [13, с. 13–14]. У 1910 г. у губерні існавалі склады пры Магілёўскім і Сенненскім сельскагаспадарчых таварыствах і Смалянскім земляробчым гуртку [14, с. 6–7]. У 1911 г. Камерцыйным аддзелам пры Быхаўскім таварыстве сельскай гаспадаркі быў створаны склад. Пачынаючы дзейнасць з капіталу ў 3 тыс. 775 р., яго абароты ў 1913 г. дасягнулі 29 тыс. 693 р. [15, с. 29].

Па звестках «Памятнай кніжкі… на 1913 год» у Магілёўскай губерні налічвалася 17 сельскагаспадарчых складоў. Асаблівасцю іх размяшчэння было тое, што яны амаль усе знаходзіліся ў павятовых цэнтрах, праз якія праходзілі чыгуначныя шляхі. У Аршанскім павеце было 5, Гомельскім і Магілёўскім па 3, Быхаўскім і Рагачоўскім па 1 складу. У Клімавіцкім, Мсціслаўскім, Сенненскім, Чавускім і Чэрыкаўскім паветах, дзе адсутнічала чыгунка, не было і складоў. Адзіным выключэннем з гэтага правіла была наяўнасць 4 складоў у Горках, што можна растлумачыць значэннем гэтага павятовага горада як буйнога цэнтра сельскагаспадарчай адукацыі. Уладальнікамі абсалютнай большасці сельскагаспадарчых складоў былі яўрэі. Толькі 3 сельскагаспадарчыя таварыствы, 2 павятовыя земскія ўправы і вучылішча ў Горках у некаторай ступені стваралі канкурэнцыю і спрыялі паніжэнню кошту на земляробчыя прылады працы [16, с. 62].

На пачатку 1915 г. у Магілеўскай губерні колькасць сельскагаспадарчых складоў значна ўзрасла і дасягнула 42. Істотны рост колькасці складоў сведчыў аб павышэнні запатрабаванасці сельскай гаспадаркі Беларусі ў падобных установах. У адрозненні ад сітуацыі, што склалася некалькі гадамі раней, склады былі ўжо у кожным павеце губерні. Іх шчыльнасць была рознай: 10 ў Аршанскім, 7 – Магілёўскім, 6 – Горацкім, 5 – Гомельскім, 4 – Рагачоўскім, 3 – Клімавіцкім, 2 – Мсціслаўскім і Чавускім, па 1 у Быхаўскім, Сенненскім і Чэрыкаўскім паветах. Сярод уласнікаў па ранейшаму значную частку складоў (17) утрымлівалі прыватныя прадпрымальнікі – яўрэі. Больш істотную ролю ў пашырэнні сельскагаспадарчай тэхнікі і штучнага ўгнаення стала адыгрываць земства, якое валодала 9 складамі. З’явіліся 6 складоў, што былі арганізаваныя мясцовымі крэдытнымі і пазыка-ашчаднымі таварыствамі. Роля сельскагаспадарчых таварыстваў знізілася. Толькі Быхаўскае ТСГ мела асабісты склад. Створаныя камерцыйныя аддзелы пры Мінскім і Магілёўскім сельскагаспадарчых таварыствах мелі па 1 складу. Земляробчыя гурткі ўтрымлівалі 3 склады [17, с. 70–72].

Такім чынам, гандлёвая дзейнасць сельскагаспадарчых таварыстваў Магілёўскай губерні заключалася як ў дапамозе, так і непасрэдным стварэнні шэрагу сельскагаспадарчых складоў. Пачатак XX ст. характарызаваўся пашырэннем сеткі складоў, што былі створаны павятовымі сельскагаспадарчымі таварыствамі. У апошнія перадваенныя гады сельскагаспадарчыя таварыствы фактычна адыходзяць ад гандлёвых спраў, перадаючы іх камерцыйным установам. Тым не менш, дзейнасць сельскагаспадарчых складоў пры сельскагаспадарчых таварыствах значна паўплывала на фарміраванне рынку, асабліва ў другой палове XIX ст. Іх функцыянаванне значна паспрыяла павышэнню канкурэнцыі, што ў сваю чаргу прыводзіла да зніжэння цаны, павышэння якасці і асартыменту ў іншых гандлевых установах. Гэта ў канчатковым выніку спрыяла тэхнічнаму пераабсталяванню як памешчыцкіх, так і сялянскіх гаспадарак.

Литература


1. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Фонд 398. – Оп. 41. – Д. 13488.
2. Протокол 3-го очередного собрания Могилевского общества сельских хозяев 16, 17 и 18 января 1881 года. – Могилев на Днепре : скоропечатня Ш. А. Фридланда, [1881]. – 1123 с.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 1178.
4. Протоколы 7-го и 8-го очередных собраний Могилевского общества сельских хозяев 17 января и 3 октября 1883 года. – Могилев на Днепре : тип. Я. Н. Подземского, [1883]. – 50 с.
5. Протоколы 5-го и 6-го очередных собраний Могилевского общества сельских хозяев 17 января и 18 октября 1882 года. – Могилев на Днепре : скоропечатня Ш. А. Фридланда, [1882]. – 17 с.
6. Major. Mohylów białoruski / Major // Kraj. – 1885. – № 28. – S. 8.
7. Протоколы заседаний общего собрания Могилевского общества сельских хозяев 25-го, 26-го февраля 1893 г. – Могилев : типо-лит. Я. Н. Подземского, [1893]. – 8 с.
8. Обзор Могилевской губернии за 1900 год. – Могилев : тип. губ. правл., 1901. – 106, [48] с.
9. Обзор Могилевской губернии за 1907 год. Приложение ко всеподданнейшему отчету. – Могилев : тип. губерн. правления, 1908. – 106, 156 с.
10. Землевладелец. Несколько слов о Могилевском сельскохозяйственном обществе / Землевладелец // Вестн. Могилев. земства. – 1914. – № 1–2. – С. 45–48.
11. Обзор Могилевской губернии за 1908 г. Приложение ко всеподданнейшему отчету. – Могилев : губерн. тип., 1909. – VI, 111, 164 с.
12. Лялин, А. Обозрение деятельности уездных земств Могилевской губернии в 1913 году / А. Лялин // Вестн. Могилев. земства. – 1914. – № 15. – С. 83–89.
13. Труды Мстиславского общества сельского хозяйства в 1895 г. – Могилев : губерн. тип., 1897. – 34, LV с.
14. Обзор Могилевской губернии за 1910 г. Изд. Могилев. губ. стат. ком. – Могилев : губерн. тип., 1911. – VI, 107, 161 с.
15. Быховское общество сельского хозяйства // Вестн. Могилев. земства. – 1915. – № 10. – С. 28–30.
16. Памятная книжка Могилевской губернии на 1913 год / Изд. Могилев. губерн. стат. ком. – Могилев : губерн. тип., 1913. – [2], VIII, [1], IX–XXXI, [21], 275, 175 с.
17. Памятная книжка Могилевской губернии на 1915 год / Изд. Могилев. губерн. стат. ком. – Могилев : губерн. тип., 1915. – XIV, 270, 195 с.